# МАКСІМ ГАРЭЦКІ

18 лютага
1893-1938



# Шляхам жыцця
## Максіма Гарэцкага

**Віртуальная выстава кніг аб жыцці і творчасці Максіма Гарэцкага з фонда бібліятэкі імя Д. Р. Новікава Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі і Цэнтральнай бібліятэкі імя М. І. Гарэцкага Дзяржаўнай установы культуры "Горацкая раённая бібліятэчная сетка"**

юбілей пісьменніка

130 гадоў



# МАКСІМ ГАРЭЦКІ

18 лютага
1893-1938

Спадчына Максіма Гарэцкага трывала займае пачэснае месца ў залатым фондзе беларускай класічнай літаратуры. І не толькі як дасканалы ўзор прыгожага пісьменства, скарб філасофскай думкі, што існуе па-за прасторай і часам. Напісаныя амаль стагоддзе таму кнігі Максіма Гарэцкага актуальныя і сёння. Уся яго творчасць прасякнута пачуццём любові да Радзімы, яе гісторыі, традыцый, нацыянальнай культуры. Нацыянальная ідэя натхняла пісьменніка, абуджала яго думку і пачуццё, вызначала змест творчасці. Ён унёс каштоўны ўклад у развіццё нацыянальнай культуры беларускага народа.

Аднак творчасць Максіма Гарэцкага, яго заслугі ў галіне развіцця беларускай дакастрычніцкай і савецкай літаратуры і культуры наогул па розных прычынах доўгі час не атрымлівалі належнай, сапраўды глыбокай і ўсебаковай ацэнкі. Толькі ў канцы 60-ых гадоў з’явілася першая больш-менш значная спроба пазнаёміць чытачоў з жыццёвым і творчым шляхам пісьменніка, вызначыць асаблівасці яго светапогляду, мастацкага стылю і індывідуальнай манеры. Гэта было зроблена Дзмітрыем Бугаёвым у манаграфічным нарысе “Максім Гарэцкі” (1968).

Для вяртання пісьменніка на яго належнае месца ў беларускай літаратуры шмат зрабіў Алесь Адамовіч. У 1980 годзе выйшла з друку яго кніга “Браму скарбаў сваіх адчыняю”, прысвечаная даследаванню жыццёвага і творчага шляху класіка беларускай літаратуры Максіма Гарэцкага, аналізу яго твораў. Некалькі кніг прысвяціў пісьменніку і Міхась Мушынскі.

Вялікую ролю ў вывучэнні розных аспектаў спадчыны Максіма Гарэцкага адыгралі Гарэцкія чытанні, гісторыя якіх пачалася на горацкай зямлі.

юбілей пісьменніка

130 гадоў

юбілей пісьменніка

130 гадоў



# МАКСІМ ГАРЭЦКІ

18 лютага

1893-1938

Менавіта тут былі арганізаваны і праведзены першыя Гарэцкія чытанні (1992 год) і юбілейныя, да 100-годдзя з дня нараджэння Максіма Гарэцкага ў 1993 годзе. Яны далі штуршок для аб’яднання навукоўцаў і прыхільнікаў пісьменніка для творчага вывучэння ўсіх бакоў яго шматграннага таленту. Зараз Гарэцкія чытані праходзяць штогод з дапамогай Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры, Рэспубліканскага фонда імя братоў Гарэцкіх, Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі, ГНУ “Інстытут геахіміі і геафізікі” (2008), Цэнтр даследванняў культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (з 2013 года).

Калі мы гаворым пра даследчыкаў жыццёвага шляху Максіма Гарэцкага, нельга не ўспомніць Уладзіміра Маісеевіча Ліўшыца, краязнаўцу, пісьменніка, які і быў ініцыятарам правядзення Гарэцкіх чытанняў у Горках. Шмат гадоў ён займаўся вывучэннем біяграфіі пісьменніка, вынікам гэтых даследванняў стала яго кніга “Сцежкамі Максіма Гарэцкага” (УА БДСГА, 2018), якая выйшла да 125-годдзя нашага таленавітага земляка.

Віртаульная выстава кніг “Шляхам жыцця Максіма Гарэцкага” з фондаў дзвюх бібліятэк (імя Д. Р. Новікава УА БДСГА і Цэнтральнай бібліятэкі імя М. І. Гарэцкага Дзяржаўнай установы культуры “Горацкая раённая бібліятэчная сетка”) падрабязней пазнаёміць вас з тымі выданнямі, што прысвечаны творчасці Максіма Гарэцкага і яго трагічнаму жыццёваму шляху. Невялікія ўмоўныя абазначэнні з сімваламі бібліятэк, якія будуць змешчаны на кожным слайдзе, дапамогуць даведацца, у фондзе якой бібліятэкі знаходзіцца тая ці іншая кніга. Чытайце творы Гарэцкага, чытайце кнігі аб ім!

юбілей пісьменніка

130 гадоў



# МАКСІМ ГАРЭЦКІ

18 лютага 1893-1938




Самай першай кнігай з грунтоўным аналізам творчасці Максіма Гарэцкага з’яўляецца манаграфія Дзмітрыя Бугаёва “Максім Гарэцкі”, якая выйшла ў 1968 годзе ў выдавецтве “Навука і тэхніка”. У выданні расказваецца пра жыццёвы і творчы шлях пісьменніка, вызначаюцца асаблівасці яго светапогляду, зроблены нагляданні над мастацкім стылем, індывідуальнай манерай Гарэцкага.

*“Арыгінальны пісьменнік і таленавіты вучоны – даследчык літаратуры, фальклярыст, мовазнаўца – Максім Іванавіч Гарэцкі на працягу ўсяго свайго вельмі нялёгкага жыцця з выключнай самаадданасцю, рэдкай бескарыслівасцю і самаахвярнасцю працаваў на ніве беларускай культуры, аддаючы ёй усяго сябе без астатку”.*

*Дзмітрый Бугаёў*



# МАКСІМ ГАРЭЦКІ

18 лютага
1893-1938

юбілей пісьменніка

130 гадоў




Даследванню жыццёвага і творчага шляха Максіма Гарэцкага прысвечана кніга вядомага беларускага пісьменніка і літаратуразнаўцы Алеся Адамовіча “Браму скарбаў сваіх адчыняю…” (выдавецтва БДУ імя У. І. Леніна, 1980 год).

*“Творчасць Максіма Гарэцкага, прысутнасць яе “гравітацыйна” ўплывае на ўсю глыбіню беларускай літаратуры XX стагоддзя. Не ўдакладніўшы месца М. Гарэцкага ў агульным працэсе развіцця беларускай і беларускай савецкай літаратуры, немагчыма правільна ўбачыць і ацаніць сам гэта працэс”.*

*Алесь Адамовіч*



# МАКСІМ ГАРЭЦКІ

18 лютага

1893-1938

юбілей пісьменніка

130 гадоў



Т. М. Дасаева

ЛЕТАПІС ЖЫЦЦЯ І ТВОРЧАСЦІ МАКСІМА ГАРЭЦКАГА

У гэты ж юбілейны 1993 год у выдавецтве "Навука і тэхніка" выйшла кніга, падрыхтаваная Таццянай Дасаевай – "Летапіс жыцця і творчасці Максіма Гарэцкага". У кнізе мовай дакументаў, успамінаў у храналагічнай паслядоўнасці ўзнаўляюцца найбольш значныя факты з жыцця і творчасці, грамадскай дзейнасці Максіма Гарэцкага.

*"Скупыя радкі "Летапісу" ствараюць панараму, якая раскрывае М. Гарэцкага як асобу шматгранную: з аднаго боку, як творцу, даследчыка, рэдактара-выдаўца, выкладчыка, лексікографа, навукоўца, палымянага публіцыста, выдатнага беларускага культурнага і грамадскага дзеяча, з другога, як чалавека – сына, брата, мужа, бацьку".*

*Таццяна Дасаева*

юбілей пісьменніка



МАКСІМ ГАРЭЦКІ

# Гарэцкія чытанні

18 лютага
1893-1938

У 1992 годзе ў Горках былі арганізаваны і праведзены першыя Гарэцкія чытанні. Ідэя іх правядзення належыла Уладзіміру Ліўшыцу, краязнаўцу, вучонаму, пісьменніку, які ў той час працаваў дырэктрам Горацкага раённага гісторыка-этнаграфічнага музея.

Пасля 1992 года Чытанні сталі рэгулярнымі і праводзіліся ў Горках, Магілёве і Мінску.

У фондах бібліятэк імя Д. Р. Новікава і Цэнтральнай бібліятэкі імя М. І. Гарэцкага захоўваюцца матэрыялы многіх навуковых канферэнцый, прысвечаных вывучэнню творчасці і жыццёвага шляха пісьменніка. З імі можна будзе пазнаёміцца на слайдах гэтай віртуальнай выставы.

На кніжных паліцах дзвюх бібліятэк захоўваюцца і сціплыя кніжкі тэзісаў дакладаў і паведамленняў першых Гарэцкіх чытанняў, якія ўжо сталі своеасаблівай каштоўнасцю, бо менавіта з іх пачаліся ўсе астатнія зборнікі.

У бібліятэцы акадэміі захоўваецца экзэмпляр Чытанняў з даравальным надпісам Радзіма Гарэцкага, пляменніка нашага вядомага земляка, які шмат зрабіў для захавання памяці аб пісьменніку.

У Цэнтральнай бібліятэцы зборнік першых Чытанняў “апранулі” у новую вокладку і кніжка стала выглядаць вельмі імпазантна.

Зараз вельмі цікава патрымаць у руках гэтыя выданні, успомніць першых аўтараў, адчуць бег часу. Як яны выглядаюць – на слайдзе ніжэй.

130
гадоў

юбілей пісьменніка

130 гадоў



# МАКСІМ ГАРЭЦКІ

18 лютага
1893-1938



391.72
Г 218 п.г.
М 81405

БЕЛАРУСКАЯ ОРДЭНА КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ
І ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА
СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЯ АКАДЭМІЯ

АДДЗЕЛ КУЛЬТУРЫ ГОРАЦКАГА РАЙВЫКАНКАМА

ГОРАЦКІ ГІСТОРЫКА-ЭТНАГРАФІЧНЫ МУЗЕЙ

## ПЕРШЫЯ ГАРЭЦКІЯ ЧЫТАННІ

ТЭЗІСЫ ДАКЛАДАЎ І ПАВЕДАМЛЕННЯЎ

(г. Горкі, 16—18 сакавіка 1992 г.)

Бібліятэцы БСГА
з найлепшымі
пажаданнямі
Э.Гарэц.
18.III.92.
Горкі

Горкі 1992



Беларуская сельскагаспадарчая акадэмія
Аддзел культуры Горацкага райвыканкама
Горацкі гісторыка-этнаграфічны музей

## Першыя Гарэцкія чытанні

Тэзісы
дакладаў і паведамленняў

Горкі 1992

юбілей пісьменніка

130 гадоў

# МАКСІМ ГАРЭЦКІ



18 лютага 1893-1938


БЕЛАРУСКАЯ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЯ АКАДЭМІЯ
АДДЗЕЛ КУЛЬТУРЫ ГОРАЦКАГА РАЙВЫКАНКАМА
ГОРАЦКІ ГІСТАРЫЧНА-ЭНТАГРАФІЧНЫ МУЗЕЙ

Да 100-годдзя з дня нараджэння М. І. ГАРЭЦКАГА

ГАРЭЦКІЯ ЧЫТАННІ

ТЭЗІСЫ ДАКЛАДАЎ І ПАВЕДАМЛЕННЯЎ

(г. Горкі, 17—19 лютага 1993 г.)

Горкі 1993

У 1993 годзе ў Беларусі адзначалася 100-годдзе з дня нараджэння Максіма Гарэцкага. Асноўныя мерапрыемствы праходзілі ў Горках, у Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі. Адбыліся другія Гарэцкія чытанні, тэзісы дакладаў і паведамленняў якіх захоўваюцца ў фондзе бібліятэкі акадэміі (на слайдзе). У дні святкавання юбілею пісьменніка на чацвёртым корпусе акадэміі была ўсталявана мемарыяльная дошка ў яго гонар, раённай бібліятэцы было прысвоена імя Максіма Гарэцкага, таксама ў яго памяць была перайменавана адна з вуліц Горак.



# МАКСІМ ГАРЭЦКІ

18 лютага
1893-1938

юбілей пісьменніка

130 гадоў







Трэція Гарэцкія чытанні адбыліся 17 – 19 лютага 1994 года ў Магілёве. Матэрыялы дакладаў і паведамленняў былі выдадзены ў двух частках, пазнаёміцца з імі можна толькі у бібліятэцы імя Максіма Гарэцкага.



# МАКСІМ ГАРЭЦКІ

18 лютага
1893-1938

юбілей пісьменніка

130 гадоў

На наступных слайдах вы зможаце  убачыць вокладкі шматлікіх Гарэцкіх чытанняў,  якія былі арганізаваны і праходзілі з дапамогай Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры, Рэспубліканскага фонда імя братоў Гарэцкіх, Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі, ГНУ “Інстытут геахіміі і геафізікі” (2008), Цэнтр даследванняў культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (з 2013).

У ніжэйпрадстаўленых зборніках адлюстраваны даклады і выступленні, якія прысвечаны жыццю і творчасці выдатных дзеячоў беларускага нацыянальнага руху XX стагоддзя братоў Гарэцкіх: класіка беларускай літаратуры, пісьменніка, літаратуразнаўца, крытыка, рэдактара-выдаўца, мовазнаўца, фалькларыста, педагога, публіцыста, грамадскага дзеяча Максіма Іванавіча і аднага з заснавальнікаў Беларускай акадэміі навук, эканаміста, дэмографа, географа, геолага, археолага, грамадскага дзеяча акадэміка Гаўрылы Іванавіча.



# МАКСІМ ГАРЭЦКІ

18 лютага

1893-1938

юбілей пісьменніка




Гарэцкія чытанні  ў 2004 годзе былі прысвечаны жыццю і творчасці Максіма і Гаўрылы Гарэцкіх.

*“З асабістых рэчаў Максіма Іванавіча Гарэцкага захаваліся: абажур, люстэрка, раменьчык, кісет, некалькі гальштукаў… Дапаўняюць вопіс музейнага фонду асабістыя рэчы Л. У. Чарняўскай-Гарэцкай: акуляры, галаўныя ўборы, прылады для вышыўкі і інш.; медалі Г. М. Гарэцкай, фрагмент рушніка з вышыўкай і карункамі Ганны Гарэцкай”.*

*Ганна Запартыка,*
*“Дакументальны і музейны фонды сям’і Гарэцкіх у БДАМЛМ”*

130 гадоў



# МАКСІМ ГАРЭЦКІ

18 лютага
1893-1938




Гарэцкія чытанії ў 2008 годзе былі прымеркаваны да 115-годдзя з дня нараджэння Максіма Гарэцкага.

*“Жыццё Максіма не было лёгкім: Першая сусветная вайна, рэвалюцыя, бальшавіцкія эксперыменты, арышты і высылкі прыводзілі да частых пераездаў, адсутнасці сваёй кватэры, недаядання, і маральнага і фізічнага прыгнёту. Больш менш нармальнае жыццё ў Максіма і яго сям’і налічвае ўсяго каля 13 гадоў. Ён нават не змог атрымаць вышэйшую адукацыю, але ўсё жыццё пільна займаўся самаадукацыяй, што зрабілася яго першапачатковай патрэбай ў любых умовах”.*

*Радзім Гарэцкі, З Прывітальнага слова*

юбілей пісьменніка

130 гадоў

юбілей пісьменніка



# МАКСІМ ГАРЭЦКІ

18 лютага

1893-1938




Гарэцкія чытанні ў 2009 годзе былі прысвечаны Году роднай зямлі

*“Уся творчасць выдатнага беларускага пісьменніка, непахіснага змагара за нацыянальнае адраджэнне Максіма Гарэцкага напоўнена пачуццём вялікай і святой любові да Бацькаўшчыны. Менавіта таму ў структуры многіх твораў важная роля адводзіцца пейзажным і ў найбольшай ступені бытавым замалёўкам. Родны край – крыніца натхнення для М. Гарэцкага. Таму многія творы пісьменніка пачынаюцца пейзажнымі апісаннямі. Але ў выніку таго, што М. Гарэцкі апісвае жыццё людзей бедных, шчырых, пакорліва-чуллівых і моцна пакрыўджаных пейзажы афарбаваны найчасцей не ў светла-зіхоткія, а ў змрочна-трагічныя колеры”.*

*Ала Жардзецкая, “Пейзажныя і бытавыя замалёўкі ў творах М. Гарэцкага”*

130 гадоў



# МАКСІМ ГАРЭЦКІ

18 лютага
1893-1938

юбілей пісьменніка

130 гадоў




Гарэцкія чытанні ў 2010 годзе былі прысвечаны 110-годдзю з дня нараджэння Гаўрылы Гарэцкага.

*“Творчая спадчына М. І. Гарэцкага ўяўляе сабой адну з найбольш цікавых старонак ў гісторыі беларускай літаратуры першай паловы ХХ стагоддзя. Шырыня мастацкай палітры пісьменніка з’яўляецца выдатным матэрыялам для плённых літаратуразнаўчых даследзінаў і сведчыць аб падрыхтаванасці тагачаснага беларускага прыгожага пісьменства да творчага ўспрыняцця мастацкіх здабыткаў сусветнай культуры”.*

*Максім Сазонаў, “Традыцыі Ф. М. Дастаеўскага ў драматызаванай аповесці М. Гарэцкага “Антон”” .*



# МАКСІМ ГАРЭЦКІ

18 лютага
1893-1938




Гарэцкія чытанні ў 2011 годзе праходзілі пад дэвізам “Праблемы выдання спадчыны”.

*“Постаць Максіма Гарэцкага на адраджэнскай ніве Беларушчыны надзвычай універсальная. Класічнасць ягонай творчасці – у плённым наробку арыгінальнага пачынальніка нацыянальнай літаратуры і, ў значна высокай ступені, у глыбінным асэнсаванні нацыянальнага быцця. Ідэйна-эстэтычнае крэда М. Гарэцкага – служыць “Духу Чыстаты і Праўды”, узнімаць “Храм” нацыянальнага Адраджэння”.*

*Аліна Сабуць, “Мастацкі феномен падзвіжніцтва Максіма Гарэцкага”.*

юбілей пісьменніка

130 гадоў






У 2012 годзе Чытанні праходзілі пад дэвізам: “Максім і Гаўрыла Гарэцкія. Жыццё і творчасць”.

*Максім і Гаўрыла Гарэцкія, акрамя усяго іншага, – сапраўдныя, прыроджаныя нацыянальныя інтэлігенты, якіх, дарэчы, і сёння так горка, так крыўдна не хапае нашаму грамадству. Непахісная сумленнасць, шырокая адукаванасць, непакзная мужнасць, тактоўнасць і паважлівасць у стасунках з самымі рознымі людзьмі не маглі не прываблівацць да іх калег і суседзяў, гасцей і выпадковых знаёмцаў.*

*Генадзь Бураўкін, “З прывітальнага слова”*



# МАКСІМ ГАРЭЦКІ

18 лютага
1893-1938

юбілей пісьменніка

130 гадоў




Гарэцкія чытанні ў 2013 годзе былі прысвечаны 120-годдзю з дня нараджэння Максіма Гарэцкага.

*“Творчая, нацыянальна-грамадзянская и асабіста-чалавечая постаць Максіма Гарэцкага ў гэтым сваім трыадзінстве была, застаецца і мае быць назаўжды катэгорыяй нязменнай значнасці ў духоўным жыцці беларускага народа. Маштабы яе не прымяншаюцца, не губляюцца ў часе, а толькі набываюць новую веліч, гістарычную неабвержанасць. А калі браць канкрэтна наш час, то і нашу падступную і неадступную надзёнасць”.*

*Васіль Зуёнак, З Прывітальнага слова*



# МАКСІМ ГАРЭЦКІ

18 лютага
1893-1938

юбілей пісьменніка

130 гадоў




Чарговыя Гарэцкія чытанні ў 2014 годзе былі прысвечаны 100-годдзю Першай і 75-годдзю Другой сусветных войнаў.

*“Беларускія даследчыкі не адойчы ўжо адзначалі, што вобраз героя-апавядальніка кнігі “На імперыялістычнай вайне” Лявона Задумы мае выразную аўтабіяграфічную аснову і за ім стаіць пісьменнік Максім Гарэцкі, якому давялося зведаць армейскае лагернае жыццё, фронт, вайну с усімі яе жахамі, удзельнічаць ў зацятых кровапралітных баях ва Усходняй Прусіі, дзе быў цяжка паранены”.*

*Зінаіда Драздова, “Вобраз героя-апавядальніка кнігі “На імперыялістычнай вайне ” Максіма Гарэцкага у хрысціянскім люстэрку”.*

юбілей пісьменніка

130 гадоў



# МАКСІМ ГАРЭЦКІ

18 лютага 1893-1938




У 2015 годзе Гарэцкія чытанні былі прымеркаваны да 115-годдзя з дня нараджэння Гаўрылы Гарэцкага і 95-годдзя першага выдання "Гісторыі беларускае літаратуры" Максіма Гарэцкага.

*"Так сталася, што навукова-практычная дзейнасць М. Гарэцкага прыпадае якраз на 20-ыя гады (калі гаварыць больш дакладна, то на 1919 – 1929 гг.) Менавіта тады прызнаны мастак слова сцвердзіў сябе і як высокапрафесійны даследчык літаратуры… Максім Гарэцкі, як і некаторыя іншыя выбітныя асобы… умеў сумяшчаць культуру, навуку, грамадскую дзейнасць, мог вызначыць прыярытэты, быў пачынальнікам у шырокім сэнсе слова".*

*Алена Гурская, "Літаратурны працэсс 1920-х гадоў у рэцэпцыі М. Гарэцкага".*

# МАКСІМ ГАРЭЦКІ



18 лютага
1893-1938

юбілей пісьменніка

130 гадоў




Гарэцкія чытанні ў 2016 годзе былі прысвечаны 95-годдзю з дня нараджэння Галіны Максімаўны Гарэцкай і 50-годдзю вяртання на Беларусь Гаўрылы Іванавіча Гарэцкага.

*"З лістоў Максіма Гарэцкага паўстае жахлівы малюнак яго існавання ў ссылцы. Ён доўга не меў пастаяннага жылля (начаваў дзе прыйдзецца), нармальнай вопраткі (сам лапіў сваё адзенне), абутку, выконваў цяжкую фізічную працу, галадаў, часта хварэў, нават трапіць ў лазню было няпроста, бо заўсёды там былі вялікія чэргі. Гарэцкі мужна пераносіў усё… Цяжка ўявіць, як можна было вытрымаць, не зламацца. Але найбольш уражвае тое, што Максім Гарэцкі ў такіх абставінах знайшоў у сабе сілы і мужнасць вярнуцца да літаратурнай творчасці".*

*Таццяна Дасаева, "Мужнасць духу"*



# МАКСІМ ГАРЭЦКІ

18 лютага
1893-1938

юбілей пісьменніка




Гарэцкія чытанні ў 2017 годзе былі прысвечаны літаратурна-мастацкай і навуковай дзейнасці братоў Гарэцкіх.

*“У гістарыяграфіі вывучэння жыцця і творчасці класіка беларускай літаратуры Максіма Гарэцкага існуе шмат прац, прысвечаных яго дзейнасці як пісьменніка, мовазнаўцы, крытыка і публіцыста. Аднак на сёняшні дзень мала ўвагі надаецца таму факту, што М. Гарэцкі з’яўляўся яшчэ і этнографам свайго часу, што яго навукова-даследчыцкія здольнасці знайшлі адлюстраванне ў мастацкіх творах. Асабліва яскрава імкненне даследаваць светапогляд, жыццёвы ўклад і культуру беларусаў за мяжой выяўляецца ў М. Гарэцкага ў цыкле апавяданняў “Сібірскія абразкі”… Яна Кнурэева, “Этнаграфічная спадчына беларусаў у цыкле апавяданняў Максіма Гарэцкага “Сібірскія абразкі”” .*

130 гадоў

юбілей пісьменніка

130 гадоў



# МАКСІМ ГАРЭЦКІ

18 лютага
1893-1938

*“Несумненна, што стаўшая ўжо традыцыйнай штогодняя канферэнцыя, прысвечаная тэме “Максім і Гаўрыла Гарэцкія. Жыццё і творчасць”, з’яўляецца не толькі надзвычай эфектыўнай і дзейснай формай гарэцказнаўства, але і значнай, неад’емнай часткай нашага літаратуразнаўства ўвогуле… Больш за тое, досьвед паказвае, што яна стала знакавай падзеяй у сэнсе нашага духоўнага самапазнання і нацыянальнага самаўсведамлення”.*

Анатоль Вярцінскі

*“Дзякуй Богу, у Гарэцкіх чытанняў ёсць усе гэта: і навізна, і апантанасць, і пранікненне ў глыбіню, і повязь з сёняшнім днём. …Гэта ўнікальная з’ява ў нашым грамадскім і культурным жыцці. Я не ведаю больш працяглых чытанняў у нас у Беларусі, якія існавалі б так доўга і выклікалі сапраўдную цікавасць, мелі глыбокі сэнс і змест”.*

Анатоль Бутэвіч

*“Вельмі прыемна, што да працы нашых Чытанняў далучаюцца новыя даследчыкі, у тым ліку моладзь і нават школьнікі. Я ўсім вельмі ўдзячны, жадаю новых творчых дасягненняў і спадзяюся, што “Гарэцкія чытанні” будуць і далей, дзякуючы маладым сілам, працаваць і пашырацца”.*

Радзім Гарэцкі



# МАКСІМ ГАРЭЦКІ

18 лютага

1893-1938

юбілей пісьменніка

130 гадоў



Мы пазнаёмілі вас з усімі зборнікамі Гарэцкіх чытанняў, якія ёсць у фондах дзвюх бібліятэк і зараз зноў звернемся да тых кніг, якія прысвечаны жыццю і дзейнасці Максіма Гарэцкага.



# МАКСІМ ГАРЭЦКІ

18 лютага
1893-1938

юбілей пісьменніка

130
гадоў

У 1984 годзе ў выдавецтве “Мастацкая літаратура” выйшла кніга “Максім Гарэцкі: Успаміны, артыкулы, дакументы” (складальнікі А. С. Ліс, І. У. Саламевіч). У выданні сабраны ўспаміны людзей, якія асабіста ведалі пісьменніка, працавалі ці сустракаліся з ім у розныя гады яго жыцця (раздзел “Успаміны”). У раздзеле “Слова пра пісьменніка і яго творчасць” адлюстраваны артыкулы літаратуразнаўцаў, якія займаліся вывучэннем спадчыны пісьменніка. Значнае месца ў зборніку займаюць дакументы, біяграфічныя матэрыялы, лісты і літаратурна-крытычныя артыкулы Максіма Гарэцкага, а таксама бібліяграфічны спіс друкаваных твораў і артыкулаў даследчыкаў яго творчасці (раздзелы “Са спадчыны Максіма Гарэцкага”, “Пісьмы”, “Бібліяграфічны паказальнік і каментарыі”.

Гэта кніга, якая захоўваецца ў фондзе бібліятэкі імя М. Гарэцкага, была падаравану Уладзіміру Ліўшыцу роднымі пісьменніка – дачкой Галінай Максімаўнай і пляменнікам Радзімам Гарэцкім, аб чым сведчаць іх аўтографы (фота на наступным слайдзе).

# МАКСІМ ГАРЭЦКІ

18 лютага
1893-1938

юбілей пісьменніка

130 гадоў







МАКСІМ ГАРЭЦКІ

успаміны
артыкулы
дакументы

406

Мінск
«Мастацкая
літаратура»
1984


Дарагому
Уладзіміру Майсеевічу
Ліўшыцу
з пашанай і
удзячнасцю
ад родных
Максіма Гарэцкага
01.11.1984.
Г. Гарэц. Г. Гарэцкая
Р. Гарэцкі.



# МАКСІМ ГАРЭЦКІ

18 лютага
1893-1938

юбілей пісьменніка

130 гадоў



МАГІЛЁЎСКАЯ АБЛАСНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ ТАВАРЫСТВА „КНІГА"
ГОРАЦКІ ГІСТАРЫЧНА – ЭТНАГРАФІЧНЫ МУЗЕЙ

Да 100-годдзя з дня нараджэння

МАКСІМ ГАРЭЦКІ – ЖЫЦЦЁ І ТВОРЧАСЦЬ

МЕТАДЫЧНЫ МАТЭРЫЯЛ І ПАРАДЫ Ў ДАПАМОГУ ПРАПАГАНДЫСТАМ КНІГІ

МАГІЛЁЎ 1993

Да 100-годдзя з дня нараджэння Максіма Гарэцкага ў Магілёўскай абласной арганізацыі "Таварыства "Кніга"" былі выдадзены метадычныя матэрыялы і парады ў дапамогу прапагандыстам кнігі, якія былі прысвечаны жыццю і творчасці Максіма Гарэцкага. Аўтары-складальнікі: У. М. Ліўшыц, В. П. Зеньковіч, Т. І. Скікевіч, М. М. Студнёва (1993).

*"У жніўні 1913 года рэдакцыя газеты "Наша Ніва", звяртаючыся да выпускніка Горацкага каморніцка-агранамічнага вучылішча Максіма Іванавіча Гарэцкага пісала: "Дужа дзякуем за Вашы творы, каторыя Вы нам прысылалі ў апошнія часы. Мы верым, што праз Вас памножана будзе слава Айчыны нашай, калі толькі агонь, каторы гарыць у Вас, будзе далей разгарацца".*

юбілей пісьменніка



# МАКСІМ ГАРЭЦКІ

18 лютага
1893-1938




Кароткі даведнік па літаратурнаму музею Максіма Гарэцкага выйшаў у Оршы ў 1997 годзе (аўтар – Уладзімір Ліўшыц). Кніга пазнаёміць чытача з экспазіцыяй музея, прысвечанага жыццю і дзейнасці Максіма Гарэцкага. Музей быў адкрыты на радзіме пісьменніка ў вёсцы Малая Багацькаўка ў 1993 годзе.

*“Літаратурны музей М. Гарэцкага пабудаваны на тым месцы, дзе знаходзілася хата сям’і Гарэцкіх. У ёй ён нарадзіўся і жыў, а потым часта наведваў на працягу ўсяго свайго шчаслівага і трагічнага жыцця”.*

*Уладзімір Ліўшыц*

130
гадоў

# МАКСІМ ГАРЭЦКІ

18 лютага
1893-1938

юбілей пісьменніка

130 гадоў






У серыі “Людзі беларускай навукі” у 1998 годзе выйшла кніга Радзіма Гарэцкага “Ахвярую сваім “я”” (выдавецтва “Беларуская навука”). Выданне прысвечана жыццю і дзейнасці братоў Максіма і Гаўрылы Гарэцкіх. Прыводзяцца архіўныя матэрыялы КДБ пра іх арышты.

*“Па характары Максім пайшоў у бацьку. Яскравы сангвінік, з праявамі халерычнасці. Назвычайна жывы, рухавы, палкі, уражлівы, непасрэдны, актыўны, успрыімлівы. Але і ад маці многае перайшло ў характар брата. Выключная дабрата, цярплівасць, стрыманасць, разважнасць, невычэрпны аптымізм, летуценнасць, самаахвярнасць”.*

*Радзім Гарэцкі*

# МАКСІМ ГАРЭЦКІ

**18 лютага**
**1893-1938**

юбілей пісьменніка

**130 гадоў**






У 2003 годзе ў выдавецтве "Беларуская навука" выйшла выпраўленае і дапоўненае выданне кнігі Дзмітрыя Бугаёва "Максім Гарэцкі". У працы аналізуецца дакастрычніцкая творчасць і творчасць савецкага часу. Сучаснасць твору надае таксама артыкул "Аплачана жыццём", змешчаны ў гэтым выданні.

*"Гэты чалавек з добрай душой і пакутніцкім лёсам валодаў надзвычай багатым, яркім і шматгранным талентам. Ён выразна адчуваў патрэбы беларускай літаратуры, культуры, нацыянальнага адраджэння і гатовы быў рабіць усё дзеля таго, каб беларуская ідэя ўвасобілася ў жыццё, паставіла наш народ нароўні з іншымі цывілізаванымі народамі свету".*

*Дзмітрый Бугаёў*



# МАКСІМ ГАРЭЦКІ

18 лютага
1893-1938

юбілей пісьменніка

130 гадоў




У 2003 годзе ў выдавецтве “Беларуская навука” была выдадзена кніга Івана Чыгрына “Паміж былым і будучым”. У ёй аўтар даследуе шляхі станаўлення творчай індывідуальнасці Максіма Гарэцкага.

*“У асобе Максіма Гарэцкага мы, несумненна, маем аднаго з буйнейшых прадстаўнікоў нашага прыгожага пісьменства навейшага часу і можам гэтым ганарыцца перад усім светам. Няхай людзі дападаюць да твораў Максіма Гарэцкага. Наталяюцца. “Брама скарбаў прыадчынена…””*

*І. П. Чыгрын*

юбілей пісьменніка

130 гадоў



# МАКСІМ ГАРЭЦКІ

18 лютага
1893-1938




У 2008 годзе у выдавецтве “Медысонт” свет убачыла кніга Радзіма Гарэцкага “Браты Гарэцкія” (серыі “Бібліятэка Бацькаўшчыны”, падсерыя “Людзі Беларусі”). Прадмову да яе напісаў літаратуразнаўца Дзмітрый Бугаёў. У выданні змешчана шмат фотаздымкаў з сямейнага альбома Гарэцкіх. У раённай бібліятэцы захоўваецца кніга з аўтографам аўтара (на слайдзе ніжэй).

*“Кніга пра братоў Гарэцкіх напісана з такімі замілаванасцю і сардэчнасцю, што кожны, хто ўважліва прачытае яе, абавязкова адчуе самаадданасць абодвух братоў у працы дзяля Беларусі, іх чалавечае высакародства, вышыню душэўных памкненняў і вялікую таленавітасць у многіх адносінах…*

*Кніга пра братоў Гарэцкіх – з’ява далёка не шараговая. Яна з тых павучальных у сваёй багатай змястоўнасці прац, якія трэба чытаць і перачытваць”.*

*Дзмітрый Бугаёў*

юбілей пісьменніка



# МАКСІМ ГАРЭЦКІ

18 лютага
1893-1938



**Гарэцкі Радзім Гаўрылавіч**

Акадэмік НАН Беларусі, замежны член Расійскай АН, доктар геолага-мінералагічных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, Дзяржаўнай прэміі БССР, прэміі імя акадэміка М. С. Шатскага Расійскай акадэміі навук, прэміі імя акадэміка В. А. Капцюга Сібірскага аддзялення РАН і Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Ганаровы дырэктар Інстытута геалагічных навук. Віцэ-прэзідэнт НАН Беларусі (1992–1997), прэзідэнт Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына» (1993–2001), старшыня Беларускага геалагічнага таварыства (1993–1999), старшыня Рэспубліканскага фонду імя братоў Гарэцкіх (з 1997 г.).

Навуковыя працы прысвечаны тэктоніцы і геадынаміцы платформаў, асабліва тэрыторыі захаду Усходне-Еўрапейскага кратона і Беларусі, геалогіі карысных выкапняў. Удзельнічаў у складанні шматлікіх тэктанічных карт. Надрукаваў шэраг твораў, прысвечаных нацыянальнаму адраджэнню Беларусі («Шляхам адраджэння», 1977; «Вечна жыве Беларусь!», 2003; «Гістарычны шлях беларускай нацыі і дзяржавы», 2002, 2005 — у сааўтарстве), жыццю і творчасці Максіма і Гаўрылы Гарэцкіх («Ахвярую сваім «Я», 1998 і інш.).

ISBN 978-985-6887-21-8



63.3 (4Беи)
Г21 4/3

Бібліятэка Бацькаўшчыны
Міжнароднае грамадскае аб'яднанне «Згуртаванне беларусаў свету "Бацькаўшчына"»

*Людзі Беларусі*
КНІГА І

Радзім Гарэцкі

## Браты Гарэцкія

1/М21530

Мінск
«Медысонт»
2008



У Горацкую раённую цэнтральную бібліятэку імя М. Гарэцкага — з удзячнасцю за ўшанаванне памяці пісьменніка

Шчыра Р. Гарэцкі

4.05.2009
г. Горкі

130 гадоў



# МАКСІМ ГАРЭЦКІ

18 лютага
1893-1938

юбілей пісьменніка

130 гадоў




Да 115-ай гадавіны з дня нараджэння Максіма Гарэцкага ў выдавецтве “Беларуская навука” (2008 год) была выдадзена кніга Міхася Мушынскага, вядомага вучонага, даследчыка творчасці пісьменніка – “Падзвіжнік з Малой Багацькаўкі”. У кнізе разглядаецца драматычны жыццёвы шлях класіка, ацэньваецца яго роля ў станаўленні нацыянальнай свядомасці, развіцці беларускай думкі і культуры.

*“Сёння Гарэцкі – агульна прызнаны класік беларускай літаратуры, адзін з самых таленавітых пачынальнікаў нацыянальнай мастацкай прозы. Сваё кароткае жыццё, якое было гвалтоўна абарвана, Гарэцкі прысвяціў высакароднай справе духоўнага адраджэння роднай краіны, выхаванню нацыянальнай свядомасці беларусаў, барацьбе за незалежнасць Бацькаўшчыны, за росквіт яе культуры”.*

*Міхась Мушынскі*

юбілей пісьменніка

# МАКСІМ ГАРЭЦКІ

18 лютага

1893-1938






У выдавецтве “Мастацкая літаратура” у серыі “Гісторыя ў асобах” ў 2013 годзе выйшла кніга Алеся Марціновіча “Брама, адчыненая ў вечнасць: дзецям пра Максіма Гарэцкага”. Гэтая першая мастацкая біяграфія класіка нацыянальнай літаратуры Максіма Гарэцкага, які адносіцца да самых выдатных прадстаўнікоў беларускага прыгожага пісьменства. Выданне кнігі прымеркавана да 120-годдзя з дня нараджэння М. Гарэцкага.

*“Брама мастакоўскіх скарбаў М. Гарэцкага адчынена ў вечнасць. Новым і новым пакаленням спасцігаць іх багацце і хараство, не перастаючы здзіўляцца таму, як шмат можа зрабіць талент, які прысвяціў сябе самаадданаму служэнню Бацькаўшчыне. М. Гарэцкаму вечна быць зоркай першай велічыні ў сузор’і нацыянальнага прыгожага пісьменства”.*

*Алесь Марціновіч*

130 гадоў



# МАКСІМ ГАРЭЦКІ

**18 лютага**
**1893-1938**

юбілей пісьменніка

**130** гадоў




Да 125-годдзя Максіма Гарэцкага ў акадэміі выйшла кніга Уладзіміра Ліўшыца "Максім Гарэцкі: сцежкамі жыцця" (2018). На аснове архіўных матэрыялаў, успамінаў родных і знаёмых, апублікаваных крыніц аўтар расказвае пра жыццёвы і творчы шлях пісьменніка, пра тыя мясціны, дзе жыў і працаваў класік беларускай літаратуры. Падрабязна аўтар расказвае і аб гістарычных падзеях, на фоне якіх жыў і працаваў пісьменнік, і аб тых людзях, якія яго акружалі. Тэкст у кнізе ілюстрыруецца шматлікімі фотаздымкамі.

юбілей пісьменніка

130 гадоў



# МАКСІМ ГАРЭЦКІ

**18 лютага**
**1893-1938**






Максім Гарэцкі ўвайшоў у літаратуру ўслед за Янкам Купалам і Якубам Коласам. Даследуючы чалавека, народ, пісьменнік надае прынцыповае значэнне асэнсаванню гісторыі і з'яўляецца фактычна пачынальнікам гістарычнага жанру ў беларускай літаратуры.

Таксама ў 2018 годзе ў выдавецтве “Мастацкая літаратура” выйшла кніга “Вернасць высокім ідэалам” (укладанне Радзіма Гарэцкага і Віктара Шніпа, мастак Усевалад Свентахоўскі). Кніга багата ілюстравана і была выдадзена ў падарункавым фармаце да 125-годдзя з дня нараджэння Максіма Гарэцкага. У кнізе два раздзелы. Аб іх падрабязней на наступных слайдах.

юбілей пісьменніка



# МАКСІМ ГАРЭЦКІ

18 лютага
1893-1938




У першым раздзеле “Вянок памяці” сабраны ўспаміны аб Максіме Гарэцкім яго блізкіх і родных (браты Гаўрыла і Парфір, жонка Леаніла Чарняўская, дачка Галіна), а таксама тых людзей, хто з ім вучыўся, працаваў (Міхась Ганчарык, Алесь Вечар, Юрка Гаўрук і інш.).

*“… Было ў Максіма Гарэцкага чалавечае абаянне, такое своеасаблівае. Можа, гэта не кожны заўважаў, але хто бліжэй быў да яго, той не мог не заўважыць. Гэта выяўлялася і ў рэдкаснай адданасці справе. Яна і накладала адбітак на яго аблічча, усю яго чалавечую асобу… Яго падтрымлівала незвычайная вернасць, адданасць літаратуры, навуцы, народу свайму беларусскаму…”*

*Юрка Гаўрук*

130
гадоў



# МАКСІМ ГАРЭЦКІ

УА БДСГА Бібліятэка імя Д. Р. Новікава

ДУК "Горацкая РБС" Цэнтральная бібліятэка імя М. Гарэцкага

**18 лютага**

**1893-1938**

юбілей пісьменніка

**130 гадоў**




У другім раздзеле "Скарбы жыцця" змешчаны такія творы Максіма Гарэцкага як "Літоўскі хутарок", "Габрыелевы прысады", "Дзве душы", "На імперыялістычнай вайне", "Скарбы жыцця" і іншыя.

*"1. Браму скарбаў сваіх адчыняю: падходжу і так, падходжу і гэтак, пасяджу, адсапнуся – і зноў адчыняю, псую сабе гумар.*
*2. Цяжкаватая брама, панурая вельмі, завесы на ёй паржавелі, замок папсаваўся, ключ у замку не хоча круціцца, замардавала мяне.*
*3. Падазрона гляджу па баках, асцярожна рыхтую запас тлумачэнняў: можа, госці залучаць, а хто яны будуць?*
*4. Чакаю спагаднага, блізкага сэрца, але ж брама адчынена ўсім… Хай заходзяць! Прыняць іх гатоў. Цярпліва, пакорна прымаю: добрым манерам я добра навучыўся… "*

*Максім Гарэцкі "Скарбы жыцця"*



# МАКСІМ ГАРЭЦКІ

18 лютага
1893-1938

юбілей пісьменніка

Для Максіма Гарэцкага, сціплага па сваёй натуры, рознабаковага таленавітага чалавека, перакананага гуманіста, клопаты пра нацыянальную культуру беларускага народа былі сапраўды той святой справай, якая давала яму вялікую энергію, стойкасць у самых складаных умовах, стала яго галоўнай жыццёвай мэтай.

Жыццё пісьменніка, якое так рана абарвалася, можна лічыць узорам самаадданага служэння Бацькаўшчыне. Самаахвярнасць Максіма Гарэцкага, яго вернасць высокім ідэалам натхніла многіх горацкіх аўтараў на стварэнне як паэтычных так і празаічных твораў, яму прысвечаных.

Знаёмцеся з імі на слайдах ніжэй.

130
гадоў

юбілей пісьменніка

130 гадоў



МАКСІМ ГАРЭЦКІ

18 лютага 1893-1938

# Ніна Кавалёва

## ПАМЯЦІ МАКСІМА ГАРЭЦКАГА

1

Не толькі тая маці нам,
Што нарадзіла, узрасціла,
А тая родная сынам,
Чыя жыве ў іх моц і сіла.

Чые пякуцца мазалі,
Чые завуць палі і гоні…
Ты сын і горацкй зямлі,
З якой твае ўзляцелі коні.

Каб заіскрыла цемра-ноч,
Патрэбны моцныя падковы,
Ды не ляцець жыцця узбоч,
Дзе лёс лунае выпадковы,

А крочыць, дзе звініць ралля.
Дзе родзіць, б’е так трапна слова,
Калі майстэрствам каваля
На шчасце зроблена падкова.

2

У Багацькаўцы сягоння
Песні матчыны шчыруюць.
Сыне родны і народны,
Землякі цябе шануюць.

Не, таго не адбылося
На тваім шляху агністым,
Каб ты здрадзіў свайму лёсу,
Здрадзіў песні асабістай.

У час знявагі і знямогі
(Каты цешыліся ўволю),
Закаваць даў рукі, ногі,
Песню ж выпусціў на волю.

І яна і сёння ў небе,
Дзе прастору так багата…
Чалавеку так патрэбна
Пры жыцці такое свята.



**МАКСІМ ГАРЭЦКІ**

18 лютага
1893-1938

# Лідзія Андрэева

Да 115-годдзя Максіма Гарэцкага

Багацькаўка Малая. Люты…
Узяў правы дваццаты век.
Стрэў яго ў лапцікі абуты
Сямігадовы чалавек.

Стаў Сейбітам ён і Аратым
І поўніў скарбніцу дзядоў…
ГУЛАг апошняю быў датай
У самым росквіце гадоў.

Быў… Боль здрады прыціхае
Сышоў парадаксальны век.
А нас Гарэцкі сустракае
Ля карпусоў, бібліятэк.

Насенне залатой эліты
Не страціць моцы праз гады,
Што беларускасцю адліта
І праз вякі дае плады.

юбілей пісьменніка

130 гадоў



МАКСІМ ГАРЭЦКІ

# Алесь Клачкоў

18 лютага

1893-1938

юбілей пісьменніка

130 гадоў

М. Гарэцкаму

Я зноў пачуў гаворку дзеда,
Маіх краёў і смех, і стогн.
Да вёскі ў падводзе еду,
Вязём паціху сена ў стог.

Хоць гэты час не так далёка,
Ды ўжо яго не разглядзець,
Малюнак іншы бачыць вока,
І пачынаеш жыць хацець.

А дар сапраўднага паэта
Гучыць з адпешчаных радкоў,
Так доўжыцца навука дзеда,
І сена смак з усіх бакоў.

2002 г.

М. Гарэцкаму

У краі ляскоў і узгоркаў
Убачыш Былыя Часы,
Дзе некалі дзіўная зорка
Шукала свае галасы.

Ды нема зямліца маўчала,
Сказаць не знаходзіла сіл.
Самому ж здавалася мала
Пражыць Час, якому не міл:

Устаўшы над брудам адчаю,
Пабачыў уперадзе свет.
Адбіткі тых слоў прыкмячаю.
Паспелых, як яблык-ранет.

2001 г.



МАКСІМ ГАРЭЦКІ

130 гадоў

юбілей пісьменніка

18 лютага 1893-1938

# Ларыса Галачова

## Чарговы ліст – апошні ліст

*прысвячаецца Максіму Гарэцкаму*

### Эсэ

І я зноў пішу свой чарговы ліст. Пішу сам для сябе. У апошні час настрой мой знаходзіцца ў заняпадзе. Я разважаю над тымі выпрабаваннямі, якія беспадстаўна і беспрычынна я вымушаны цярпець трэці раз.

Раніцою я перачытваў ліст, які напісаў учора. І з учарашняга дня нічога не змянілася. Гэтак цягнецца ўжо каторы тыдзень.

Што я адчуваю? Перадаць словамі амаль немагчыма. Адчуванне такое, што хоцацца крычаць, а голасу нібы няма. Я адарваны ад усяго, што натхняла, давала жыццёвыя сілы, было сэнсам жыцця: родная зямля, найдаражэйшая ў свеце сям’я, родныя, сябры. Я існую, бо жыццё маё толькі там, толькі з імі. Цяжка мне тут, ой, як цяжка. Не, фізічнага цяжару я амаль не адчуваю. А вось душа, мая душа, прыціснута так, нібы я зрабіў удых, а выдыхнуць ужо не магу. Нібы я, як той звер, загнаны ў вугал, гляджу ў вочы драпежніку, адчуваю такі жах, аж сэрца калоціцца ў грудзях, шукаю выйсця... Шукаю і не знаходжу. І толькі тоненькая, амаль празрыстая надзея на выратаванне, усё яшчэ трымціць у душы. Вось такі настрой пануе і кіруе маім сённяшнім днём (дарэчы, як і ўчора, пазаўчора і тыдзень назад).



# МАКСІМ ГАРЭЦКІ

18 лютага
1893-1938

І ўсё ж такі трапіць трэці раз у лапы да звера! Вось гэта мне “пашанцавала”, нічога не скажаш. Двойчы я губляў самае дарагое, двойчы вяртаў усё назад. І зноў, зноў адабралі, адарвалі, спусташылі і загналі ў вугал. Але не ўлічылі аднаго: у чалавека можна адабраць усё, а вось думкі – яны падуладны толькі самому чалавеку. Гэта той маленькі куток шчасця, тое месца, дзе ўвасабляюцца жаданні і мары, адбываюцца сустрэчы, жыццё разгортваецца па іншаму сцэнарыю. Думкі – прастор для волі. Толькі ў думках я кожны дзень побач са сваёй сям’ёй. Я побач з ёй, маёй адзінай, непаўтарнай, каханай... Я зноў і зноў успамінаю наша спатканне, мае першыя пачуцці, узнаўляю ў памяці кожную хвілінку, праведзеную разам з ёю. Мае любыя, родныя дзеці, мой працяг. Ці ўбачу я, як вы вырасцеце, ці дачакаюся ўнукаў? Мая сарамлівая, ласкавая матуліна мова. Як хочацца пачуць мне родную гаворку! Мова душы і сэрца майго! Як не хапае мне тваёй мілагучнасці, мяккасці, напеўнасці! Мая Радзіма, мая зямля, мая Беларусь! Я мужчына, я бацька, я сын і брат, я сын зямлі сваёй! Я да апошняй кроплі Беларус!

юбілей пісьменніка

130 гадоў



# МАКСІМ ГАРЭЦКІ

18 лютага
1893-1938

Вы ўсе там, а я тут. Толькі думкі пра вас грэюць мяне, напаўняюць светам і прымушаюць верыць і спадзявацца, што маё “тут” скончыцца і пачнецца “там” з вамі. Маё месца побач з вамі, і я павінен быць на сваім месцы!

Дарэчы, пра месца. Чамусьці ўспомніў словы адной жанчыны, якую выпадкова спаткаў у цягніку. Яны адклаліся ў памяці і ўсплылі толькі зараз. Дзівачка, тады яна сказала мне: “Хлопча, твая жыццёвая васьмёрка ўжо выпала і блукае, але прыйдзе час, калі яна знойдзе сваё месца і не зрушыцца з яго”. Напэўна, жанчына прадракала мне доўгае жыццё, гадоў да васьмідзесяці або да васьмідзесяці васьмі. А калі верыць у гэта, дык сумаваць мне зусім не трэба, бо яшчэ палова жыцця наперадзе.

Ну што ж, пажывём – убачым. На сёння я развітваюся сам з сабою. Не сумуй, Максім Беларус, не сумуй. Да сустрэчы ў заўтрашнім дні.

P.S. Сёння 10 лютага 1938 года.

юбілей пісьменніка

130 гадоў



# МАКСІМ ГАРЭЦКІ

18 лютага
1893-1938

юбілей пісьменніка

130 гадоў

## Віртуальную выставу падрыхтавалі:

Студнёва Марыя Міхайлаўна,
галоўны бібліятэкар аддзела
гуманітарна-асветніцкай
работы бібліятэкі
імя Д. Р. Новікава  УА БГСХА



Марозава Алена Аляксандраўна,
загадчыца аддзела абслугоўвання
Цэнтральнай бібліятэкі
імя М. І. Гарэцкага
ДУК «Горацкая раённая
бібліятэчная сетка»

